Лілія Дзямешка




# У студэнцкім жыцці – вялікая падзея

У верасні падчас прафесійнага свята – Дня бібліятэк – у бібліятэцы Беларускага дзяржаўнага універсітэта культуры адбылася прэзентацыя вучэбнага дапаможніка дырэктара Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі, доктара педагагічных навук Р.С. Матульскага «Общее библиотековедение» (М.: Либерия, 2004. – 223 с.). Удзел у мерапрыемстве прынялі рэктар, доктар пед. навук, прафесар, заслужаны дзеяч адукацыі Рэспублікі Беларусь Я.Д. Грыгаровіч, прарэктары універсітэта, дактары навук, прафесары А.І. Смолік, М.А. Бяспалая, дэкан факультэта, прафесар М.А. Яцэвіч, загадчыкі кафедраў, выкладчыкі, студэнты.

З прывітальным віншаваннем выступіла рэктар Я.Д. Грыгаровіч. Яна адзначыла знамянальнасць падзеі для студэнтаў і выкладчыкаў: магчымасць абмеркаваць і асэнсаваць вялікі ўклад Р.С. Матульскага ў развіццё бібліятэчнай справы Беларусі менавіта ў Дзень бібліятэк.

Дэкан факультэта прафесар М.А. Яцэвіч нагадаў прысутным звесткі з біяграфіі Р.С. Матульскага, адзначыў вехі яго працоўнага і творчага шляху – ад студэнта факультэта да бібліятэкара, выкладчыка, дацэнта; ад дэкана факультэта да дырэктара буйнейшай у краіне Нацыянальнай бібліятэкі.

Асабісты пункт гледжання, аналіз і ацэнку вучэбнаму дапаможніку «Общее библиотековедение» выказалі выкладчыкі спецыяльных дысцыплін і студэнты факультэта.

В.Е. Лявончыкаў, доктар пед. навук, прафесар, загадчык кафедры тэорыі і гісторыі інфармацыйна-дакументных камунікацый, назваў вучэбны дапаможнік значнай з'явай у вышэйшай бібліятэчнай адукацыі Рэспублікі Беларусь. У сваім выступленні ён разглядзеў змест вучэбнага дапаможніка, які прысвечаны асноўным тэарэтычным пытанням бібліятэказнаўства, менавіта сутнасці бібліятэкі як сацыяльнага інстытута, прынцыпам і функцыям яе дзейнасці, тыпалагізацыі і класіфікацыі бібліятэк. Васіль Емяльянавіч адзначыў: «Вядома, што па гэтых праблемах існуюць падручнікі і вучэбныя дапаможнікі расійскіх аўтараў. Аднак у іх усе прыклады, фактаграфічныя звесткі прыводзяцца з практыкі работы бібліятэк Расійскай Федэрацыі. Упершыню ў агульны тэарэтычны курс уведзены фактаграфічны нацыянальна-рэгіянальны кампанент, што дазволіць студэнтам не звяртацца да многіх артыкулаў па бібліятэчнай справе

аб Беларусі. Акрамя таго, па агульных тэарэтычных пытаннях існуюць розныя погляды, часам супрацьлеглыя сцвярджэнні. Яны прыведзены ў вучэбным дапаможніку, але Р.С. Матульскі ставіць у навуковае абгрунтаванне свае арыгінальныя погляды на місію бібліятэк у сучасным грамадстве, на прынцыпы і функцыі іх дзейнасці. Гэта дазваляе выкладчыкам перайсці ад ілюстрацыйна-інфармацыйнага метаду выкладання да праблемнага навучання, якое дазволіць здзейсніць творчы ўзровень адукацыі.»

Загадчык кафедры менеджменту інфармацыйна-дакументнай сферы, кандыдат пед. навук, дацэнт С.В. Зыгмантовіч адзначыла важкі ўклад у бібліятэчную справу Р.С. Матульскага, аўтара дзвюх манаграфій, зборніка нарматыўных дакументаў, вучэбнага дапаможніка, шматлікіх артыкулаў, выдадзеных раней. Выданне «Общего библиотековедения» расійскім выдавецтвам «Либерия» сведчыць аб прызнанні Рамана Сцяпанавіча вядучым спецыялістам не толькі на Беларусі, але і за яе межамі. Каштоўнасць вучэбнага дапаможніка, на думку Святланы Вікенцьеўны, у тым, што ён прысвечаны аднаму з важнейшых раздзелаў бібліятэказнаўства – вучэнню аб бібліятэцы. Раскрыццё ў падручніку праблем сацыяльнай сутнасці, прынцыпаў дзейнасці бібліятэк і іх каштоўнасных дэтэрмінант, сацыяльных функцый бібліятэк, класіфікацыі і тыпалагізацыі бібліятэк вызначаецца метадалагічным статусам не толькі для бібліятэказнаўства, але і для распрацоўкі праблем бібліятэчнай бібліяграфіі.

Адной з актуальнейшых праблем выкладання спецдысцыплін з'яўляецца ўстанаўленне міжпрадметных сувязей, што дазваляе пазбегнуць дубліравання ў выкладанні, з аднолькавых пазіцый падыйсці да фарміравання ў студэнтаў уяўленняў аб базавых фундаментальных паняццях.

Патрэбна адзначыць навізну работы, уласны канцэптуальны падыход аўтара да раскрыцця праблем, новую сучасную трактоўку некаторых традыцыйных паняццяў і з'яў. Асаблівасцю падручніка з'яўляецца падрабязнае раскрыццё эвалюцыі тэарэтычных поглядаў бібліятэказнаўцаў на пэўныя праблемы. Гэта сведчыць аб тым, што падручнік разлічаны на высокі інтэлектуальны патэнцыял студэнтаў.

Прафесар кафедры інфармацыйных рэсурсаў Н.А. Ляйко ацаніла вучэбны дапаможнік Р.С. Матульскага з пункту гледжання яго структуры, тэрміналогіі. Ніна Андрэеўна звярнула ўвагу на тое, што «ў кожнай з глаў выдзелены: сутнасць паняццяў (бібліятэка, яе прынцыпы, функцыі, класіфікацыя тыпалогіі), эвалюцыя поглядаў навукоўцаў на тую ці іншую праблему (указаны прозвішчы навукоўцаў і іх адносіны да асобных праблем у галіне бібліятэказнаўства ў пэўны перыяд) і інш. Аўтарам зроблена спроба раскрыць сутнасць бібліятэкі як сучаснага сацыяльнага інстытута, паказаць узаемасувязь паміж падсістэмамі сістэмы «бібліятэка» і ўзаемадзеянне знешняга фактара (асяроддзя) на развіццё бібліятэк, вызначыць задачы, перспектывы іх развіцця ў інфармацыйным грамадстве.

Асаблівае значэнне ў падручніку надаецца вызначэнню сутнасці інстытутаў, якія забяспечваюць стварэнне, апрацоўку, пошук і выкарыстанне інфармацыі, у першую чаргу, сутнасць бібліятэкі як сучаснага сацыяльнага інстытута. Аўтар сцвярджае, што прагрэс і будучае развіццё інфармацыйных тэхналогій, звязанае са зборам, апрацоўкай, захаваннем і выкарыстаннем інфармацыі, доступ да айчынных і сусветных інфармацыйных рэсурсаў маюць вялікае значэнне, вызначаюць інтэлектуальную, эканамічную, палітычную і нават ваенную магутнасць краіны.

Для рэалізацыі пастаўленых задач у зборніку прысутнічае адпаведны дапаможны апарат, у першую чаргу – «Тэрміналагічны слоўнік». Ён уключае галіновыя тэрміны, якія выкарыстоўваюцца ў падручніку. Трэба адзначыць, што ў Р.С.Матульскага сучасная трактоўка тэрмінаў: бібліятэка, бібліятэкар, бібліятэчны фонд, дакумент, інфармацыя, класіфікацыя, даведачны апарат звязана з уплывам сацыяльных, эканамічных і культурных фактараў.

Шэрагу тэрмінаў аўтар упершыню дае дэфініцыю. У прыватнасці, ім вылучаны і абгрунтаваны такія паняцці, як «бібліятэчны персанал», «інфармацыйнае грамадства», «агульная бібліятэка», «нацыянальны дакумент», «нацыянальны бібліятэчны фонд» і інш. Лепшаму засваенню матэрыялу будуць спрыяць таксама «Пералік умоўных абазначэнняў» і «Спіс крыніц» да кожнай главы.

Вучэбны дапаможнік адпавядае патрабаванням для такога тыпу выданняў. Ён неабходны і карысны студэнтам і выкладчыкам факультэта інфармацыйна-дакументных камунікацый, можа выкарыстоўвацца не толькі пры падрыхтоўцы да экзамена па курсу «Агульнае бібліятэказнаўства», але і пры напісанні курсавых і дыпломных работ. Вучэбны дапаможнік уяўляе таксама цікавасць для супрацоўнікаў бібліятэк, органаў навукова-тэхнічнай інфармацыі і кніжнага гандлю.

Студэнтка V курса Юлія Лапука павіншавала студэнтаў малодшых курсаў, якія змогуць спасцігаць бібліятэказнаўства па новаму дапаможніку, змест якога падрабязна і дасканала раскрывае генезіс і сутнасць бібліятэкі як сацыяльнага інстытута, яе прынцыпы і функцыі; разглядае бібліятэку як сістэму, выкладае канцэптуальныя асновы і перспектывы развіцця бібліятэк на будучыню. Студэнтка станоўча ацаніла структуру дапаможніка, вывады (рэзюме) пасля кожнай главы, што, безумоўна, спрыяе лепшаму засваенню матэрыялу.

Вольга Няборская, студэнтка 531 гр., выказала ўласнае ўражанне аб даступнасці і лёгкасці ўспрымання двухконтурнай сутнаснай сістэмнай мадэлі бібліятэкі, дадзенай Р.С. Матульскім, у параўнанні з матэрыяламі іншых аўтараў (гэтай праблеме студэнтка прысвяціла тэму курсавой работы).

Напрыканцы вечарыны Р.С. Матульскі выказаў словы ўдзячнасці выкладчыкам і студэнтам, павіншаваў прысутных з вялікім святам – Днём бібліятэк.

Вечарына прайшла цікава, ажыўлена, весела. Гэтаму садзейнічаў сцэнарый, распрацаваны студэнтамі 531 гр. пры падтрымцы студэнтаў 537 гр. і кафедры менеджменту інфармацыйна-дакументнай сферы (кіраўнік праекта – дацэнт С.А. Паўлава).

Па ходу сцэнарыя Р.С. Матульскаму задавалі розныя пытанні, у тым ліку бліц-апытанне наконт асабістых інтарэсаў і захапленняў. Прысутныя ацанілі гумар госця прэзентацыі. Выклікала ажыўленне і цікавае прадстаўленне навуковых прац Рамана Сцяпанавіча, якіх ужо на сучасны момант налічваецца больш за 150.

Змястоўна і артыстычна вёў мерапрыемства студэнт 531 гр. Раман Абрамчук. Прэзентацыю ў Power Point вялі студэнты 537 гр. Антон Лысянкоў і Аляксандр Кухацкаволец. Музычным афармленнем займалася Вольга Лук'янава. У сцэнарыі актыўна ўдзельнічалі Вольга Няборская, Кацярына Аляксеенка, Наталля Варапай, Ірына Нікіціна.